# Т Э С Т Ы

## УВОДЗІНЫ

У вучэбна-метадычныя распрацоўкі ўключаны тэсты па наступных тэмах курса “Беларуская мова. Прафесійная лексіка”: “Мова і соцыум”, “Гістарычныя этапы фарміравання беларускай мовы”, “Стылістыка і функцыянальныя стылі”, “Навуковы стыль”, “Афіцыйна-справавы стыль”, “Лексіка”, “Культура маўлення”.

У тэсты па культуры маўлення змешчаны заданні, звязаныя з вызначэннем парушэнняў арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, марфалагічных і сінтаксічных нормаў беларускай літаратурнай мовы. Прыводзіцца таксама кантрольны тэст па культуры маўлення, які складаецца з 40 заданняў.

Тэсты можна выкарыстоўваць для працы на практычных занятках, для бягучага і выніковага кантролю ведаў пры вывучэнні тэм курса “Беларуская мова. Прафесійная лексіка”.

Вучэбна-метадычныя распрацоўкі прызначаны для студэнтаў 1–3 курсаў вочнай і завочнай формаў навучання.

## Т э с т 1. МОВА І СОЦЫУМ

**А1. Мова – гэта:**
1) найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі
2) згуртаванне, аб'яднанне людзей
3) сацыяльная, або грамадская, з'ява
4) сістэма знакаў, гукаў
5) сістэма лексіка-граматычных сродкаў, прызначаная для зносін паміж людзьмі ў грамадстве.

**А2. Для чаго выкарыстоўваецца мова?**
1) звязвае, яднае пакаленні людзей
2) для матэрыяльнага замацавання ведаў
3) як інструмент пазнання
4) раз'ядноўвае людзей
5) галоўны фактар захавання нацыянальнай свядомасці.

**А3. Вызначце асноўныя рысы мовы.**
1) зменлівасць (дынамічнасць)
2) сістэмнасць
3) знакавасць
4) сацыяльны характар
5) свядомасць.

**А4. Вызначце функцыі мовы ў грамадстве.**
1) камунікатыўная
2) гукаперамальная
3) намінатыўная
4) метамоўная
5) адлюстравання

**А5. Вызначце функцыі мовы ў грамадстве.**
1) пазнавальная
2) экспрэсіўная
3) эстэтычная
4) біблейская
5) фатычная.

**А6. У чым заключаецца сутнасць камунікатыўнай функцыі?**
1) ажыццяўляе накіраванасць на кантакт, падтрымку камунікацыі
2) функцыя зносін паміж людзьмі
3) функцыя тлумачэння таго, што незразумела ў паведамленні
4) ажыццяўляецца адлюстраванне ўзаемаадносін чалавека з навакольным светам
5) з'яўляецца помнікам працы ўсіх пакаленняў людзей, з яе дапамогай адбываецца фіксацыя ўсіх дасягненняў чалавецтва.

**А7. У чым заключаецца сутнасць намінатыўнай функцыі?**
1) ажыццяўляе адлюстраванне ўзаемаадносін чалавека з навакольным светам

2) адлюстраванне знешняй рэчаіснасці, навакольнага свету

3) з’ўляецца галоўным спосабам выражэння думак і пачуццяў кожнага чалавека

4) увасабляецца ў мастацкай літаратуры, сцэнічным маўленні, красамоўстве; паказвае прыгажосць жывога слова

5) функцыя зносін паміж людзьмі.

**А8. У чым заключаецца сутнасць пазнавальнай функцыі?**

1) з дапамогай пэўных моўных сродкаў адрасант уздзейнічае на адрасата і выказвае пажаданне, просьбу, загад, каманду

2) матэрыяльны замацавальнік ведаў, непасрэдны інструмент пазнання

3) функцыя тлумачэння таго, што незразумела ў паведамленні

4) звязвае, яднае пакаленні людзей, адбываецца фіксацыя ўсіх дасягненняў чалавецтва

5) сродак зносін паміж людзьмі.

**А9. У чым заключаецца сутнасць экспрэсіўнай функцыі?**

1) тлумачэнне незразумелага ў паведамленні

2) выказванне пажадання, просьбы, загаду, каманды

3) ажыццяўляюцца ўзаемаадносіны чалавека з навакольным светам

4) засваенне малымі дзецьмі роднай мовы ў працэсе навучання замежным мовам

5) выяўляюцца галоўныя рысы чалавека, яго светапогляд, малюецца яго ўнутраны партрэт.

**А10. У чым заключаецца сутнасць эстэтычнай функцыі?**

1) падтрымка дыялога, што праяўляецца праз выкарыстанне слоў і выразаў тыпу *ага, ну, так-так, добра, далей* і г.д.

2) увасабленне ў мастацкай літаратуры, сцэнічным маўленні, красамоўстве

3) фіксацыя ўсіх дасягненняў чалавецтва; звязвае, яднае пакаленні людзей

4) галоўны фактар захавання нацыянальнай свядомасці

5) функцыя зносін паміж людзьмі.

**А11. Выберыце фармулёўку Біблейскай канцэпцыі паходжання мовы.**

1) мова ўзнікла з выкрыкаў, якія суправаджалі калектыўную працу

2) Бог надзяліў людзей здольнасцю да мовы, якую яны выкарыстоўвалі для наймення рэчаў

3) мова ўзнікла ў выніку перайманне гукаў мовы

4) звязвае паходжанне мовы з тымі натуральнымі гукамі, якімі насычана біялагічнае жыццё самога чалавека

5) мова ўзнікла ў выніку калектыўнага пагаднення.

**А12. Выберыце фармулёўку гукапераймальнай канцэпцыі.**

1) мова ўзнікла ў працэсе эвалюцыі
2) змены ва ўмовах жыцця чалавека садзейнічалі ўзнікненню мовы
3) мова ўзнікла ў выніку калектыўнага пагаднення
4) мова ўзнікла з выкрыкаў, якія суправаджалі калектыўную працу людзей
5) мова ўзнікла ў выніку пераймання (імітацыі) гукаў прыроды.

**А13. Выберыце фармулёўку выклічнікавай канцэпцыі.**

1) мова ўзнікла з выкрыкаў, якія суправаджалі калектыўную працу людзей
2) мова ўзнікла ў выніку пераймання (імітацыі) гукаў прыроды
3) мова ўзнікла ў выніку пераймання гукаў, якімі насычана біялагічнае жыццё самога чалавека
4) Бог надзяліў людзей здольнасцю да мовы, якую яны выкарыстоўвалі для наймення рэчаў
5) мова ўзнікла ў працэсе эвалюцыі.

**А14. Выберыце фармулёўку тэорыі Дарвіна.**

1) мова ўзнікла ў працэсе сумеснай дзейнасці людзей
2) мова ўзнікла ў працэсе эвалюцыі чалавека
3) Бог надзяліў людзей здольнасцю да мовы, якую яны выкарыстоўвалі для наймення рэчаў
4) мова ўзнікла ў выніку пераймання гукаў прыроды
5) мова ўзнікла з выкрыкаў, якія суправаджалі калектыўную працу людзей.

**А16. Якія напрамкі даследаванняў мае мовазнаўства?**

1) этналінгвістыка, рыторыка
2) сацыялінгвістыка, параўнальная лінгвістыка
3) геаграфія, геадэзія
4) эстэтыка, філасофія
5) псіхалінгвістыка, матэматычная лінгвістыка.

**А17. Што такое білінгвізм?**

1) выкарыстанне трох і больш моў у працэсе зносін
2) філасофскае вучэнне пра сутнасць і формы прыгожага ў мастацкай творчасці
3) папераменнае карыстанне дзвюма мовамі ў працэсе зносін
4) навука пра сутнасць, будову, функцыянаванне і развіццё мовы
5) найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі.

**А18. Якія існуюць разнавіднасці двухмоўя?**

1) дзяржаўнае
2) поўнае, або суцэльнае
3) нацыянальнае
4) матэрыялістычнае

5) індывідуальнае 6) групавое.

**А19. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы (віды двухмоўя і іх азначэнне).**

| | |
|---|---|
| А. Індывідуальнае<br>Б. Групавое<br>В. Поўнае<br>Г. Нацыянальнае<br>Д. Дзяржаўнае | 1. Распаўсюджана сярод прадстаўнікоў усёй нацыі.<br>2. Характэрна для ўсіх сацыяльных груп народа.<br>3. Дзвюма мовамі валодаюць асобныя прадстаўнікі калектыву.<br>4. Статус дзяржаўнай маюць дзве мовы.<br>5. Двухмоўнымі з'яўляюцца цэлыя групы насельніцтва або сацыяльныя слаі. |

**А20. Што такое полілінгвізм?**

1) філасофскае вучэнне аб маралі, яе развіцці, прынцыпах, нормах і ролі ў грамадстве
2) выкарыстанне трох і больш моў у працэсе зносін
3) псіхалагічны накірунак у мовазнаўстве
4) аратарскае мастацтва чалавека
5) любоў да слова.

**А21. Выберыце азначэнне паняцця "дзяржаўная мова".**

1) афіцыйная мова, на якой працуюць дзяржаўныя і адміністрацыйныя органы, грамадскія арганізацыі, навуковыя, навучальныя і культурныя ўстановы
2) мясцовая разнавіднасць мовы, якая адрозніваецца ад сумежных гаворак своеасаблівымі фанетычнымі, граматычнымі і лексічнымі рысамі
3) мова, на якой гаворыць дадзены народ у дадзены перыяд
4) алегарычная мова, пры дапамозе якой скрываецца прамы сэнс выказвання
5) асаблівасць маўлення, манера гаварыць.

**А22. Дайце азначэнне паняцця "моўная інтэрферэнцыя".**

1) узаемадзеянне двух або больш працэсаў, пры якіх адбываецца ўзмацненне або паслабленне аднаго з іх пры іх накладанні адзін на аднаго
2) узаемапранікненне моўных элементаў у выніку кантактавання роднасных моў, ужыванне пры маўленні на адной мове элементаў другой мовы, што прыводзіць да парушэння нормаў гэтых моў
3) папераменнае карыстанне дзвюма мовамі ў працэсе зносін
4) навука пра сутнасць, будову, функцыянаванне і развіццё мовы
5) найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі.

**А23. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы (віды інтэрферэнцыі і іх азначэнне).**

| | |
|---|---|
| **А.** Фанетычная<br>Б. Акцэнталагічная<br>В. Лексічная<br>Г. Марфалагічная<br>Д. Сінтаксічная | 1. Вынік няправільнай пастаноўкі націску пад уплывам іншай мовы.<br>2. Адхіленне ў маўленні ад марфалагічных нормаў адной мовы пад уплывам іншай мовы.<br>3. Ужыванне ў маўленні на адной мове гукаў іншай мовы.<br>4. Выкарыстанне ў адной мове раўназначных слоў іншай мовы без патрэбы.<br>5. Перанос з адной мовы ў маўленне на другой мадэляў пабудовы словазлучэнняў і сказаў. |

**А24. Адзначце рускія фанетычныя рысы ў беларускім маўленні.**

1) фрыкатыўнае [г]
2) выбухное [г]
3) мяккі гук [ч]
4) дзеканне і цеканне
5) мяккі гук [р]

**А25. Марфалагічная інтэрферэнцыя выяўляецца:**

1) ва ўжыванні назоўнікаў у неўласцівых формах роду пад уплывам іншай мовы
2) у парушэнні дзеяслоўнага кіравання пад уплывам іншай мовы
3) ва ўжыванні назоўнікаў у неўласцівых формах ліку пад уплывам іншай мовы
4) у памылках у кардынацыі дзейніка і выказніка
5) у памылках ва ўтварэнні формаў ступеняў параўнання прыметнікаў пад уплывам іншай мовы.

## Т э с т 2. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**А1. Колькі ўсяго моў існуе ў свеце?**

1) 250 моў
2) 1000 моў
3) каля 6000 моў
4) 3000 моў
5) 1600 моў

**А2. Якой мовай карысталіся славяне ў ІІІ тысячагоддзі да н.э.?**

1) царкоўнаславянскай мовай
2) агульнаславянскай мовай-асновай, або праславянскай мовай
3) беларускай мовай
4) усходнеславянскай мовай
5) лацінскай мовай

**А3. Калі сфарміравалася праславянская мова-аснова?**

1) да сярэдзіны I ст. да н.э.
2) VI ст. н.э.
3) X ст. н.э.
4) XIII ст. н.э.
5) XIX ст. н.э.

**А4. Калі адбыўся распад агульнаславянскага моўнага адзінства?**

1) I ст. н.э.
2) XVIII ст. н.э.
3) XIII ст. н.э.
4) IX ст. н.э.
5) VI ст. н.э.

**А5. Хто насяляў тэрыторыю сучаснай Беларусі?**

1) крывічы
2) дрыгавічы
3) драўляне
4) паляне
5) радзімічы

**А6. Калі, па меркаванні даследчыкаў, утварылася беларуская мова?**

1) II – VII стст.
2) VII – VIII стст.
3) XIX ст.
4) III ст.
5) IV ст.

**А7. Хто з’яўляецца вынаходнікам літарнага пісьма для славян?**

1) Кірыла Тураўскі
2) Ефрасіння Полацкая
3) Кірыл і Мефодзій
4) Францыск Скарына
5) Сымон Будны

**А8. Калі пачалася пісьмовая эпоха ў гісторыі ўсходніх славян?**

1) XI ст.
2) IX ст.
3) 1517 г.
4) 863 г.
5) X ст.

**А9. Вызначце асветнікаў XII ст., якім належыць значная роля ў станаўленні беларускага пісьменства.**

1) Кірыла Тураўскі
2) Клімент Смаляціч
3) Аўраамій Смаленскі
4) Францыск Скарына
5) Ефрасіння Полацкая

**А10. Даследчыкі лічаць XIII ст. пачатковым этапам фарміравання старажытнай беларускай мовы і беларускай народнасці, паколькі**

1) у помніках пісьменства гэтага перыяду больш шырока адлюстраваны моўныя асаблівасці, якія вылучалі насельніцтва сучаснай Беларусі яшчэ ў межах Полацкага і Тураўскага княстваў
2) Кіеўская Русь да гэтага перыяду распалася
3) помнікаў пісьменства гэтага перыяду не выяўлена

**А11. У склад якой дзяржавы ўваходзіла Беларусь у XIV ст.?**

1) Маскоўскай дзяржавы
2) Кіеўскай Русі
3) Вялікага Княства Літоўскага
4) Польскага каралеўства
5) Рэчы Паспалітай

**А12. Калі пачала складвацца беларуская народнасць з уласцівай ёй беларускай мовай?**

1) XIV – XVI стст.
2) XI – XIV стст.
3) XXI ст.
4) XIX ст.
5) XX ст.

**А13. Які статус мела беларуская мова ў ВКЛ?**

1) мовы царквы
2) дзяржаўная мова
3) літаратурная мова
4) мова фальклору
5) побытавая мова

**А14. На якой мове вялося справаводства ў ВКЛ?**

1) на старабеларускай
2) на рускай
3) на царкоўнаславянскай
4) на ўсходнеславянскай
5) на лацінскай

**А15. Колькі тамоў «Літоўскай метрыкі» дайшло да нашага часу?**

1) 5 тамоў
2) каля 600 тамоў
3) каля 400 тамоў
4) 100 тамоў
5) 300 тамоў

**А16. Старажытная беларуская мова выкарыстоўвалася ў Вялікім Княстве Літоўскім**

1) у знешніх эканамічных адносінах
2) у якасці дзяржаўнай мовы ва ўсіх сферах
3) як мова міжнародных зносін
4) у вуснай народнай творчасці
5) у побыце людзей

**А17. Калі пачалося кнігадрукаванне ва ўсходніх славян?**

1) 1517 г.
2) 1564 г.
3) 1569 г.
4) 1596 г.
5) 1696 г.

**А18. Які перыяд старажытнабеларускага пісьменства ўвайшоў у гісторыю культуры пад назвай «залаты век»?**

1) XV – XVI стст.
2) XVII XVIII стст.
3) XIX ст
4) XIV ст.
5) XIII ст.

**А19. Адзначце час, калі старабеларуская мова дасягнула найвышэйшага ўзроўню свайго развіцця.**

1) XVII ст.
2) XX ст.
3) XVI ст.
4) XIII ст.
5) XIV г.

**А20. У XVII – XVIII стагоддзях працяглы час заняпаду і нават забыцця перажылі:**
1) беларуская, чэшская і балгарская мовы
2) большасць славянскіх моў
3) толькі беларуская мова
4) руская мова
5) усе славянскія мовы, акрамя рускай

## Т э с т 3. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**А1. У канцы XVI ст. пачалася актыўная паланізацыя школы ў сувязі з тым, што:**
1) у выніку Люблінскай уніі беларуская мова была забаронена
2) змянілася моўная палітыка ВКЛ
3) у выніку Люблінскай уніі Беларусь аказалася ў складзе Рэчы Паспалітай
4) у выніку акаталічвання беларускага народа
5) у выніку распаду ВКЛ

**А2. Якое рашэнне прыняў Сойм Рэчы Паспалітай у 1696 г.?**
1) пісаць усе дзелавыя паперы па-польску, а не па-беларуску
2) пісаць толькі па-беларуску
3) пісаць на рускай мове
4) пісаць на лацінскай мове
5) пісаць на польскай і на беларускай мове

**А3. У Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Беларусі:**
1) дзяржаўнай мовай становіцца польская мова
2) дзяржаўнай мовай становіцца беларуская мова
3) дзяржаўнымі становяцца дзве мовы – польская і беларуская
4) дзяржаўнай мовай становіцца руская мова
5) дзяржаўнай мовай становіцца лацінская мова

**А4. У канцы XVIII ст. (1795 г.) у выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Беларусь:**
1) была далучана да Расіі
2) была далучана да Літвы
3) была далучана да Украіны
4) была далучана да Польшчы
5) стала самастойнай краінай

**А5. Хто з беларускіх пісьменнікаў XIX ст. загаварыў пра беларускую мову як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры?**
1) Ян Чачот
2) Максім Танк
3) Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч
4) Уладзіслаў Сыракомля
5) Францішак Багушэвіч

**А6. Калі быў прыняты закон аб свабодзе друку?**

1) у 1905 г.
2) XIX ст.
3) 1933 г.
4) 26 студзеня 1990 г.
5) 1957 г.

**А7. Адзначце перыядычныя выданні пачатку XX ст.**

1) «Наша хата»
2) «Саха»
3) «Лучынка»
4) «Роднае слова»
5) «Беларус»
6) «Раніца»

**А8. З імёнамі якіх пісьменнікаў звязаны пачатак нацыянальнага Адраджэння ў XX ст.?**

1) браты Лёсікі
2) Б. Тарашкевіч
3) С. Полацкі
4) Ф. Скарына
5) М. Гарэцкі

**А9. Калі пачалося нацыянальнае адраджэнне беларускага народа, уздым нацыянальна-вызваленчага руху і працэс складвання новай літаратурнай мовы?**

1) XVIII ст.
2) XVII ст.
3) XIX ст.
4) 1900 г.
5) 1795 г.

**А10. Хто быў першым складальнікам нарматыўнай граматыкі беларускай мовы?**

1) Я. Карскі
2) Ф. Багушэвіч
3) Я. Купала
4) Б. Тарашкевіч
5) С. Некрашэвіч

**А11. Калі адбылася першая рэформа беларускай мовы?**

1) 1957 г.
2) 1933 г.
3) 1960 г.
4) 1934 г.
5) 1937 г.

**А12. Калі адбылася другая рэформа беларускай мовы?**

1) 1957 г.
2) 1933 г.
3) 1990 г.
4) 1958 г.
5) 1988 г.

**А13. Калі быў прыняты «Закон аб мовах у Беларускай ССР», які пацвердзіў дзяржаўны статус беларускай мовы?**

1) 1989 г.
2) 1995 г.
3) 26 студзеня 1990 г.
4) 2 верасня 1990 г.
5) 1991 г.

**A14. Калі пачалі дзейнічаць новыя «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»?**

1) 18 студзеня 2006 г.
2) 24 чэрвеня 2008 г.
3) 1 верасня 2010 г.
4) 1 верасня 2009 г.
4) 2 студзеня 2010 г

**A15. Да якой сям'і моў адносяцца славянскія мовы?**

1) цюркскай
2) угра-фінскай
3) семіта-хаміцкай
4) банту
5) індаеўрапейскай

**A16. Да якой моўнай групы належыць беларуская мова?**

1) германскай
2) раманскай
3) балцкай
4) іранскай
5) славянскай

**A17. У якую са славянскіх падгруп уваходзіць найменшая колькасць моў?**

1) усходнеславянская
2) заходнеславянская
3) паўднёваславянская

**A18. Якія мовы ўваходзяць ва ўсходнеславянскую моўную групу?**

1) балгарская
2) беларуская
3) руская
4) польская
5) украінская

**A19. Якія мовы ўваходзяць у заходнеславянскую моўную групу?**

1) славенская
2) польская
3) славацкая
4) сербалужыцкая
5) чэшская

**A20. Якія мовы адносяцца да паўднёваславянскай моўнай групы?**

1) харвацкая
2) сербская
3) македонская
4) беларуская
5) балгарская

## Т э с т 4. СТЫЛІСТЫКА

**A1. Устанавіце адпаведнасць паміж стылямі і іх характарыстыкай.**

| | |
|---|---|
| **А.** Афіцыйнасць, выкладанне інфармацыі ў форме прадпісання, канстатацыі, сцвярджэння | **1.** Навуковы |
| **Б.** Вобразнасць, свабодны выбар слоў і выразаў | **2.** Публіцыстычны |
| **В.** Ужыванне тэрмінаў, доказнасць, лагічнасць | **3.** Афіцыйна-справавы |
| **Г.** Аператыўнасць, дакладнасць і даступнасць | **4.** Мастацкі |
| **Д.** Спалучэнне элементаў усіх стыляў | **5.** Гутарковы |

**А2. Устанавіце адпаведнасць паміж стылямі і сферамі іх выкарыстання.**

| | |
|---|---|
| **А.** Духоўная сфера жыцця грамадства<br>**Б.** Афіцыйныя службовыя, адміністрацыйна-прававыя і дыпламатычныя адносіны<br>**В.** Сфера навукі, тэхнікі і навучання<br>**Г.** Сфера бытавых зносін<br>**Д.** Сфера грамадскіх адносін, СМІ | **1.** Навуковы<br>**2.** Публіцыстычны<br>**3.** Афіцыйна-справавы<br>**4.** Мастацкі<br>**5.** Гутарковы |

**А3. Вызначце стыль тэксту.**

Ландыш цвіце ў маі – чэрвені. Народныя назвы – краспак, канвалія, камвалея лесавая. Сцябло невысокае, трохграннае, кветкі белыя, вельмі духмяныя. У аднабокіх гронках звычайна да дваццаці званочкападобных кветачак. Вакол гронкі два-тры эліпсападобныя жылкаватыя завостраныя лісты. Каштоўная лекавая і дэкаратыўная расліна. Колькасць яе ў апошнія гады рэзка скарацілася. Адчувае патрэбу ў беражлівых адносінах.

1) мастацкі
2) навуковы
3) гутарковы
4) публіцыстычны
5) афіцыйна-справавы

**А4. Вызначце стыль тэксту.**

Ведаеце, мінулай вясной я ў стэпе пабываў. Першы раз. Ну і прыгажосць. Куды ні глянь – мора пышнай травы і кветак. А кветкі! Якіх толькі няма! А ўсялякіх птушак – безліч! Так і заліваюцца на розныя лады. А ў небе – ястрабы. Ды штук дзесяць. Крылы распасцёртыя, і глядзяць уніз, каб чым пажывіцца. Убачаць зайца – бух уніз, і зайцу каюк. А курапатак колькі! Так і шныраюць. Была б у мяне стрэльба – настраляў бы шмат. Не панесці. Ды я не паляўнічы. Птушак люблю.

1) мастацкі
2) навуковы
3) публіцыстычны
4) афіцыйна-справавы
5) гутарковы

**А5. Вызначце стыль тэксту.**

Згодна з 2-й сесіяй ЦВК БССР ад 15 ліпеня 1924 г. апарат падлеглых ВСНГ БССР устаноў і прадпрыемстваў павінен быў з 15/VI-1927 г. Перайсці на працу па-беларуску. Аднак шмат трэстаў і гаспадарчых адзінак да гэтага часу вядуць перапіску з ВСНГ БССР выключна на рускай мове.

Дзеля чаго загадваю:

1. Усім трэстам, гаспадарчым адзінкам і прадпрыемствам (акрамя Гомельшчыны) з 15 ліпеня г.г. поўнасцю перавесці свой апарат на беларускую мову.

2. З 15 ліпеня 1928 г. прымаць на службу на аднолькавыя пасады толькі тых грамадзян, якія ведаюць беларускую мову.

Старшыня ВСНГ БССР.

1) мастацкі
2) афіцыйна-справавы
3) навуковы
4) публіцыстычны
5) гутарковы

**А6. Вызначце стыль тэксту.**

Лёгка нарадзіць, ды нялёгка ўскарміць. І нашы продкі ведалі гэта не горш за нас. Таму і шукалі розныя спосабы, каб дапамагчы самім сабе. Так, напрыклад, першую кашульку свайму дзіцяці маці імкнулася ўыць не з новага палатна, а са старызны і так, каб у ёй не было ні каўнерыка, ні рубца з наваротам. Тады лічылася, што дзіця будзе расці паслухмянае і ласкавае.

1) мастацкі
2) публіцыстычны
3) навуковы
4) афіцыйна-справавы
5) гутарковы

**А7. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Людзі добрай волі, шырокія колы грамадскасці, … і іншыя афіцыйныя асобы, намеціць новыя рубяжы, мірнае суіснаванне, гарант бяспекі, на варце парадку, атмасфера разрадкі.

1) гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А8. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Мець месца, прыцягнуць да адказнасці, давесці да ведама, аказаць садзеянне, ажыццяўляць кіраўніцтва, праявіць цікавасць, выключыць магчымасць, зрабіць справаздачу, на парадку дня, знаходзіцца ў стане, мы, ніжэйпадпісаныя.

1)гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А9. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Неабходна заўважыць, гаворка ідзе пра …, можна зрабіць вывад, варта падкрэсліць, праблематыка пытання, такім чынам, як было адзначана вышэй, зроблена спроба паказаць, у аснову пакладзена, … і гэтак далей, па-першае, па-другое…, у дадзеным выпадку.

1) гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А10. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Даверчая грамата, падняць жалезны занавес, дыпламатычная недатыкальнасць, прыняць пад увагу, ратыфікаваць пагадненне, мець месца, сустрэча на вышэйшым узроўні.

1) гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А11. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Парламент, дэбаты, сацыяльны статус, сімпозіум, кангрэс.

1) гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А12. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка:**

Прыхапіла марозам, найшло ўтрапенне, не даваць ганьбы, абяцанка-цацанка, ласка-пакора, з глузду з'ехаць, напароцца на мядзведзя, дальбог, нарабіць гвалту, шыбаваць нацянькі, крычаць немым голасам.

1) гутарковы
2) мастацкі
3) афіцыйна-справавы
4) навуковы
5) публіцыстычны

**А13. Адзначце, якія кампаненты складаюць схему тэксту-апавядання.**

1) уступ (завязка
2) вывады
3) асноўная частка
4) агульнае ўяўленне аб прадмеце
5) развязка

**А14. Адзначце жанры мастацкага стылю.**

1) санет
2) рэпартаж
3) аповесць
4) рэцэнзія
5) камедыя

**А15. Адзначце прыметы гутарковага стылю.**

1) натуральнасць маўлення
2) строгая лагічнасць
3) дакладнасць
4) сціслась
5) непасрэднасць

**А16. Вызначце стыль тэксту і запішыце тое слова, якое не характэрна для гэтага стылю.**

Мясцовасць скрозь была няроўная. Часам трапляўся высакаватыя ўзгоркі, невялікія ўзвышшы, і сялянскія загоны на іх то падымаліся ды апускаліся, то перарываліся пералескамі. Здавалася, нейкая казачная ткачыха зрабіла гэты маляўнічы дэкор.

**А17. Вызначце стыль тэксту і запішыце тое слова, якое не характэрна для гэтага стылю.**

Неба над галавой чыстае-чыстае, ні воблачка. Сонца смаліць ад самага ранку, іанасфера нагрэлася да таго, што і дыхнуць, здаецца, нельга. Толькі тут, у лесе, гуляў слабы ветрык.

**А18. Адзначце жанры публіцыстычнага стылю.**

1) лекцыя
2) рэпартаж
3) інтэрв'ю
4) балада
5) нататка

**А19. Выберыце слова, якое з'яўляецца лішнім.**

1) рэпартаж
2) фельетон
3) кодэкс
4) нарыс
5) інтэрв'ю

**А20. Адзначце, якія кампаненты складаюць схему тэксту-апісання.**

1) агульнае ўяўленне аб прадмеце
2) развязка
3) выразныя прыкметы прадмета
4) доказы
5) адносіны аўтара

## Т э с т 5. НАВУКОВЫ СТЫЛЬ

**А1. Адзначце стыль, у якім ужываюцца наступныя словы (словазлучэнні): *арфаэпія, сінус, малекула, вуглярод.***

1) публіцыстычны
2) навуковы
3) афіцыйна-справавы
4) гутарковы
5) мастацкі

**А2. Укажыце сферы выкарыстання навуковага стылю.**

1) навука
2) мастацкая літаратура
3) тэхніка
4) публіцыстыка
5) адукацыя

**А3. Вызначце мэту навуковага стылю.**

1) уздзейнічаць на пачуцці людзей
2) паведамляць пра дасягненні навукі і тэхнікі
3) даносіць да чытача аргументаваную інфармацыю
4) афармляць юрыдычныя дзеянні асоб і дзяржавы
5) абслугоўваць дыпламатычную сферу грамадскай дзейнасці

**А4. Адзначце прыметы навуковага стылю.**

1) ацэначнасць
2) строгая дакладнасць
3) лагічнасць
4) пафаснасць мовы
5) афіцыйнасць

**А5. Адзначце прыкметы навуковага стылю.**

1) натуральнасць маўлення
2) строгая лагічнасць
3) сцісласць
4) дакладнасць
5) непасрэднасць

**А6. Адзначце прыкметы навуковага стылю.**

1) ацэначнасць
2) строгая дакладнасць
3) узнёсласць
4) пафаснасць мовы
5) афіцыйнасць

**А7. Вызначце стыль тэксту і запішыце тое слова, якое не характэрна для гэтага стылю.**

Дуб – род вечназялёных і лістападных дрэў і кустоў сямейства букавых. Вядома каля 600 відаў, пашыраных у паўночным паўшар'і і ў гарах трапічнага пояса. На Беларусі вядомы два віды ў прыродных умовах і сем відаў інтрадукавана. Дуб на Беларусі – адна з асноўных лесаўтваральных парод. Драўніна моцная і гнуткая, мае высокія фізіятэхнічныя ўласцівасці і сімпатычную тэкстуру. Выкарыстоўваецца ў розных галінах прамысловасці і гаспадаркі.

**А8. Знайдзіце моўныя сродкі, характэрныя для навуковага стылю.**

1) агульнаўжывальныя словы
2) памяншальна-ласкальныя словы
3) тэрміны
4) дыялектызмы
5) абстрактная лексіка

**А9. Знайдзіце і запішыце жанр навуковага стылю.**

1) трыялет
2) нарыс
3) дыпломная праца
4) эсэ
5) загад

**А10. Адзначце жанры навуковага стылю.**

1) дысертацыя
2) акт
3) рэферат
4) балада
5) даведка

**А11. Адзначце жанры навуковага стылю.**

1) пратакол
2) трыялет
3) нарыс
4) анатацыя
5) загад

**А12. Суаднясіце лексіку навуковага стылю з яе групай**

| | |
|---|---|
| **А.** Функцыянаваць, абумоўліваць, характарызавацца, з’яўляцца, называцца, вынікаць<br>**Б.** Мікрабіялогія, флора, мітахондрыі, генэзіс<br>**В.** Такім чынам, акрамя таго, па-першае, тым не менш, верагодна, згодна з, на наш погляд | **1.** Сродкі лагічнай сувязі<br>**2.** Агульнанавуковая лексіка<br>**3.** Тэрміны |

**А13. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| 1. Адназначнасць тэрміна<br>2. Сістэмнасць<br>3. Адсутнасць канатацый | А. Лексічнае значэнне тэрміна не павінна ўтрымліваць эмацыянальнасць, ацэначнасць, экспрэсію.<br>Б. Кожны тэрмін павінен абазначаць толькі адно паняцце ў навуцы або тэхніцы.<br>В. Кожны тэрмін з’яўляецца адзінкай пэўнай тэрміналагічнай сістэмы |

**А14. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| 1. Нетэрміналагічная лексіка<br>2. Агульнанавуковая лексіка<br>3. Тэрміналагічная лексіка<br>4. Сродкі лагічнай сувязі | А. Словы з адцягненымі, абагульняльнымі значэннямі<br>Б. Злучнікі і злучальныя словы<br>В. Лексіка, якая ўжываецца ў розных сферах навукі<br>Г. Сукупнасць спецыяльных назваў з розных галін навукі і тэхнікі |

**А15. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| 1. Лагічнасць<br>2. Дакладнасць<br>3. Доказнасць<br>4. Абагульненасць (абстрактнасць)<br>5. Аб’ектыўнасць | А. Выкарыстанне адназначных навуковых сродкаў, слоў, тэрмінаў<br>Б. Інфармацыя падаецца ў пэўнай паслядоўнасці, несупярэчліва<br>В. Разгляд праблемы з розных пунктаў гледжання, адсутнасць суб’ектыўных падыходаў, эмацыянальных ацэнак<br>Г. Прыводзяцца аргументы на карысць разгляданых палажэнняў<br>Д. Адбор сродкаў, якія надаюць тэксту адназначнасць і навуковую дакладнасць |

**А16. Адзначце, якія кампаненты складаюць схему тэксту-разважання.**

1) выразныя прыметы прадмета;
2) тэзіс;
3) кульмінацыя;
4) доказы;
5) вывады

**А17. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова адносіцца да спецыяльнай лексікі.**

1) вячэрні *змрок*
2) *муфта* счаплення
3) валодаць *красамоўствам*
4) кантынентальны *шэльф*
5) светлая *надзея*

**А18. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова адносіцца да спецыяльнай лексікі.**

1) кінуць *позірк*
2) *пята* дзвярэй
3) паверыць у *шчырасць*
4) *падушка* механізма
5) гіпертанічны *крыз*

**А19. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова адносіцца да спецыяльнай лексікі.**

1) *іанізацыя* паветра
2) паваліцца ад *знямогі*
3) *глотагенез* славян
4) *імкненне* да прыгожага
5) *пастарэнне* металу

**А20. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова адносіцца да спецыяльнай лексікі.**

1) на *світанку* жыцця
2) *чуласць* да хараства
3) прамавугольная *матрыца*
4) *танаж* вагона
5) *карэкцыя* зроку

## Т э с т 6. АФІЦЫЙНА-СПРАВАВЫ СТЫЛЬ

**А1. Вызначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка**

Рэквізіт, фармуляр, службовае поле, фармуляр-узор, штамп, рэзалюцыя, левая частка аркуша, рэгістрацыйны нумар.

1) публіцыстычны
2) навуковы
3) афіцыйна-справавы
4) гутарковы
5) мастацкі

**А2. Адзначце, для якога стылю характэрна наступная лексіка.**

Існец, наймальнік, адказчык, непрызнанне, аказаць дапамогу, узяць на кантроль, за справаздачны перыяд, прыняць меры, дагаворныя бакі, выдаць загад.

1) публіцыстычны
2) навуковы
3) афіцыйна-справавы
4) гутарковы
5) мастацкі

**А3. Якія сферы дзейнасці абслугоўвае афіцыйна-справавы стыль?**

1) канцылярскую, афіцыйна-справавую
2) юрыдычную, дыпламатычную
3) галіны навукі, тэхнікі

4) галіну адукацыі
5) бытавую сферу

**А4. Адзначце прыметы афіцыйна-справавога стылю.**
1) вобразнасць
2) непасрэднасць маўлення
3) строгая аб'ектыўнасць
4) канкрэтнасць
5) эмацыянальнасць

**А5. Укажыце асаблівасці афіцыйна-справавога стылю.**
1) эмацыянальнасць
2) інфармацыйнасць
3) аб'ектыўнасць
4) дакладнасць
5) стандартызацыя
6) вобразнасць

**А6. Укажыце, што характэрна для афіцыйна-справавога стылю.**
1) спецыяльныя моўныя сродкі
2) ужыванне лічэбнікаў
3) моўныя звароты, або канцылярскія штампы
4) выкарыстанне малюнкаў, ілюстрацый
5) выкарыстанне дыялогаў

**А7. Укажыце, якія падстылі мае афіцыйна-справавы стыль.**
1) заканадаўчы
2) вучэбна-навуковы
3) адміністрацыйна-канцылярскі
4) навукова-даведачны
5) дыпламатычны

**А8. Адзначце жанры афіцыйна-справавога стылю.**
1) нататка
2) рэзюмэ
3) п'еса
4) даверанасць
5) пратакол

**А9. Выберыце слова, якое з'яўляецца лішнім.**
1) даверанасць
2) нататка
3) заява
4) справаздача
5) загад

**А10. Дакумент – гэта:**

1) матэрыяльны аб'ект з замацаванай у ім інфармацыяй для перадачы яе ў часе і прасторы

2) традыцыйны лінейны запіс, надрукаваны загадзя, але з прабеламі, якія запаўняюцца пры канчатковым афармленні ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі

3) паслядоўнасць сінтаксічна аформленых сказаў.

4) адпаведным чынам складзеныя, падпісаныя і засведчаныя справавыя паперы, якімі афармляюцца розныя гаспадарчыя аперацыі, прававыя адносіны і дзеянні юрыдычных асоб і грамадзян.

5) тэкст, вытрыманы ў адным стылі.

**А11. Укажыце, якія функцыі выконвае дакумент.**

1) інфармацыйную
2) арганізацыйную
3) эстэтычную
4) камунікатыўную
5) юрыдычную
6) выхаваўчую

**А12. Адзначце групы службовых дакументаў.**

1) асабістыя
2) распарадчыя
3) фінансавыя і ўліковыя
4) арганізацыйныя
5) традыцыйныя
6) пастаянныя

**А13. Адзначце рэквізіты службовых дакументаў.**

1) герб
2) эмблема
3) дата
4) адрасат
5) абзац
6) подпіс
7) візы
8) пячатка
9) анкета
10) табліца
11) грыф узгаднення

**А14. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Асабістыя дакументы<br>**Б.** Распарадчыя дакументы<br>**В.** Адміністрацыйна-арганізацыйныя дакументы<br>**Г.** Інфармацыйна-даведачныя дакументы<br>**Д.** Арганізацыйныя дакументы<br>**Е.** Фінансавыя і ўліковыя дакументы | **1.** Даведка, акт, тлумачальная запіска<br>**2.** Распіска, заява, аўтабіяграфія<br>**3.** Загад, пастанова, распараджэнне<br>**4.** Бухгалтарскі баланс, плацёжныя даручэнні, квітанцыі<br>**5.** Статут, палажэнне, інструкцыя<br>**6.** Кантракт, план, дамова, справаздача, канстытуцыя |

**А15. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Аспект справавога ліста<br>**Б.** Моўная формула справавога ліста<br>**В.** Кампазіцыя справавога ліста<br>**Г.** Канцылярскія штампы<br>**Д.** Расшчэпленыя выказнікі | **1.** Паслядоўнасць размяшчэння яго састаўных частак (аспектаў)<br>**2.** Выражаныя словазлучэннем (прыняць удзел, аказаць дапамогу)<br>**3.** Думка (тэма), якая выказана адным або некалькімі сказамі<br>**4.** Устойлівы зварот, словазлучэнне, якія паказваюць на характар функцыі гэтага ліста<br>**5.** Устойлівыя звароты, якія паўтараюцца пры апісанні аднолькавых сітуацый |

**А16. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Акт<br>**Б.** Кантракт<br>**В.** Дагавор<br>**Г.** Хадайніцтва<br>**Д.** Завяшчанне | **1.** Зварот з афіцыйнай просьбай аб чым-небудзь; дакумент з афіцыйнай просьбай<br>**2.** Афіцыйны дакумент, распараджэнне каго-небудзь аб сваёй маёмасці на выпадак смерці<br>**3.** Афіцыйны дакумент, пратакол, запіс аб якім-небудзь юрыдычным факце<br>**4.** Пісьмовае або вуснае пагадненне пра ўзаемныя абавязацельствы<br>**5.** Дагавор, пагадненне з узаемнымі абавязацельствамі для дагаворных бакоў |

**А17. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Абанемент<br>**Б.** Абанент<br>**В.** Адрасат<br>**Г.** Адрасант<br>**Д.** Юрыскон-сульт<br>**Е.** Юрыдычная асоба | **1.** Асоба, якой адрасавана паштовае адпраўленне, тэлеграма<br>**2.** Кансультант пры ўстанове па практычных пытаннях права<br>**3.** Права і дакумент на карыстанне чым-небудзь пэўны час<br>**4.** Арганізацыя, якая мае ва ўласнасці адасобленую маёмасць і выступае ў судзе ад свайго імя<br>**5.** Асоба, якая карыстаецца абанементам<br>**6.** Асоба, якая пасылае паштовае ці тэлеграфнае адпраўленне, адпраўнік |

**А18. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Коміваяжор<br>**Б.** Маклер<br>**В.** Менеджар<br>**Г.** Негацыянт<br>**Д.** Экспедытар | **1.** Асоба, якая займаецца адпраўкай, рассылкай чаго-небудзь<br>**2.** Аптовы купец, які вядзе гандаль пераважна за межамі сваёй краіны<br>**3.** Раз'язны гандлёвы агент фірмы, які заключае гандлёвыя пагадненні і мае пры сабе ўзоры тавару, прэйскуранты, каталогі і г.д.<br>**4.** Пасрэднік пры ўчыненні ўгод на фондавых, таварных і валютных біржах<br>**5.** Кіраўнік кампаніі, банка, фінансавай установы |

**А19. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Брокер<br>**Б.** Дылер<br>**В.** Інкасатар<br>**Г.** Інвестар<br>**Д.** Ліхвяр | **1.** Асоба, арганізацыя аба дзяржава, якая робіць інвестыцыю, укладчык<br>**2.** Той, хто бярэ вельмі высокія, не дазволеныя законам працэнты за пазычаныя грошы<br>**3.** Пасрэднік на таварнай, фондавай або валютнай |

| | |
|---|---|
| | біржы , які ўчыняе ўгоды на продаж і куплю<br>**4.** Фізічная або юрыдычная асоба, якая займаецца перапродажам тавараў, каштоўных папер і валют<br>**5**. Службовая асоба, якая робіць прыём грошай ад арганізацый для здачы іх у банк |

**А20. Суаднясіце левую і правую часткі табліцы**

| | |
|---|---|
| **А.** Інфляцыя<br>**Б.** Дэвальвацыя<br>**В.** Дэнамінацыя<br>**Г.** Дэфляцыя<br>**Д.** Індэксацыя<br>**Е.** Нуліфікацыя | **1.** Працэс стрымлівання росту грашовай масы ў абарачэнні з мэтай павысіць яе пакупную здольнасць<br>**2.** Карэкціроўка велічыні даходаў фізічных асоб у грашовых адзінках РБ з бюджэтных крыніц з мэтай частковага пакрыцця страт, выкліканых інфляцыяй<br>**3.** Абвяшчэнне дзяржавай рэзка абясцэненых грошай несапраўднымі<br>**4.** Перапаўненне сферы абарачэння грашовымі знакамі і, як вынік, іх абясцэньванне<br>**5.** Узбуйненне грашовай адзінкі краіны з мэтай спарадкавання грашовага абарачэння і надання большай паўнацэннасці нацыянальнай валюце<br>**6.** Памяншэнне афіцыйнай колькасці золата ў грашовай адзінцы краіны або зніжэнне яе курсу ў адносінах да валют іншых краін, якое праводзіцца ў заканадаўчым парадку |

## Т э с т 7. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

**А1. Адзначце словы, вымаўленне якіх адпавядае літаратурнай норме.**

1) каман[дз'і]роўка
2) сар[ты]роўка
3) гвар[дэ]ец
4) арыен[ц'і]р
5) [дз'і]пламатычны

**А2. Адзначце рады слоў, вымаўленне якіх адпавядае літаратурнай норме.**

1) ка[ры]дор, та[рэ]лка
2) жор[сц]кі, фра[з'эја]логія
3) [к'у]вет, ка[лі]дор
4) жор[ст]кі, та[л'э]рка
5) [з'г'і]нуць, [с'к'і]раваць

**А3. Адзначце слова, якое па-беларуску вымаўляецца і пішацца з прыстаўным зычным.**

1) опера
2) олово
3) омуль
4) орден
5) впустую

**А4. Адзначце слова, вымаўленне якога не адпавядае арфаэпічнай і арфаграфічнай нормам.**

1) біклага
2) розум
3) каўбаса
4) гасціннічны
5) шыя

**А5. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.**

1) салетра
2) парадкаваць
3) паразвешваць
4) суфлёр
5) увесну

**А6. Адзначце слова, пры перакладзе якіх на беларускую мову губныя зычныя гукі будуць вымаўляцца цвёрда.**

1) семья
2) восемь
3) периодика
4) бильярд
5) мебель

**А7. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання зычных у аснове слова.**

1) вавёрка – вавёрке
2) чаромха – на чаромсе
3) кветка – на кветцы
4) сцяг – на сцязе
5) чарга – па чарге

**А8. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання зычных у аснове слова.**

1) казка – у казцы
2) горка – на горке
3) страха – на страхе
4) падлога – на падлозе
5) муха – аб мухе

**А9. Адзначце словы з націскам на першым складзе.**

1) ячнішча
2) рубель
3) жывіца
4) наталіць
5) выпадак

**А10. Адзначце словы з націскам на другім складзе.**

1) агрэст
2) пасланец
3) бязвыплатна
4) абламаны
5) вусы

**А11. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя гукі.**

1) пр**а**цаўнік
2) ак**у**нь
3) вадз**я**ны
4) хрысці**я**нін
5) драўлян**ы**

**А12. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя гукі.**

1) чат**ы**рнаццаць
2) пааб**а**пал
3) м**а**ленькі
4) гект**а**р
5) марм**у**р

**А13. Адзначце назоўнікі, у якіх пры змене формы склону змяняецца месца націску.**

1) верасень
2) заданне
3) даведнік
4) палетак
5) мяжа

**А14. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца чаргаванне зычных.**

1) смуга
2) парог
3) друк
4) вандроўка
5) пірог

**А15. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты правільна.**

1) *балотны* колер
2) *балоцісты* колер
3) *балоцістая* мясцовасць
4) *дзейсныя* меры
5) *дзейсны* чалавек

**А16. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты няправільна.**

1) *выратавальны* круг
2) *запаведныя* лясы
3) *рашчыніць* вокны
4) *ступні* лесвіцы
5) *цагляны* колер

**А17. Знайдзіце словазлучэнне, у якім парушана лексічная спалучальнасць слоў.**

1) арганізатарскі талент
2) ёдзістая соль
3) натуральная велічыня
4) жытнёвы хлеб
5) вынаходніцкія здольнасці

**А18. Знайдзіце памылку ў лексічнай спалучальнасці слоў і запішыце правільны варыянт.**

Часам некаторыя аўтары дазваляюць сабе празмерную палёгку – безадказнае станаўленне да паэтычнага радка.

**А19. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя або граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. На камяністым беразе ракі ніякай раслінасці здаўна не было.
2. Душа чалавека мудрэй за розум яго.
3. З такім амаль камяністым выразам твару яго бачылі ці не ўпершыню.
4. Давялося адразу пайсці за сваімі рэчамі ў гасцініцу.

5. Звычка смяяцца над таварышамі на гэты раз падвяла самаўпэўненага Віктара Пятровіча.

**А20. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя або граматычныя нормы беларускай мовы.**
1. Пяць доўгіх вёрстаў вельмі стамілі нашых падарожнікаў.
2. Гэтая злая сабака зусім не спалохала мужчыну.
3. Тры пятых соткі агарода былі засаджаны памідорамі.
4. Сатварыць сваю сям’ю – мара амаль кожнай сталай жанчыны.
5. Гэтае смачнае яблыка так і хацелася адразу з’есці.

## Т э с т 8. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

**А1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не адпавядае літаратурнай норме.**
1) [капустны]
2) [Кранштадт]
3) [макулатура]
4) [дз’іод]
5) [брыз’энт]

**А2. Адзначце рады слоў, вымаўленне якіх адпавядае літаратурнай норме.**
1) ра[дыjо], [сэ]сія
2) [дjабал], Поль[шч]а
3) [с’э]сія, [Н’а]свіж
4) прафе[с’іjа]нал
5) кампо[ст]ны, Поль[ш]а

**А3. Адзначце слова, якое па-беларуску вымаўляецца і пішацца з прыстаўным зычным.**
1) ордер
2) учёба
3) озёра
4) внук
5) вничью

**А4. Адзначце слова, вымаўленне якога не адпавядае арфаэпічнай і арфаграфічнай нормам.**
1) народны
2) вазіць
3) матацыкл
4) гарадцкі
5) аўтобус

**А5. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.**
1) паветра
2) падкаваць
3) развесці
4) фарбаваць
5) улетку

**А6. Адзначце словы, пры перакладзе якіх на беларускую мову губныя зычныя гукі будуць вымаўляцца цвёрда.**
1) воробьи
2) семь
3) библиотека
4) миллиард
5) метр

**А7. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання зычных у аснове слова.**

1) смуга – у смуге
2) парог – на парозе
3) зборка – пры зборке
4) вандроўка – у вандроўке
5) стог – на стозе.

**А8. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання зычных у аснове слова.**

1) берагу – беражэш
2) вуха – у вухе
3) трывога – у трывоге
4) прасіць – прашу
5) плямінка – плямінке

**А9. Адзначце словы з націскам на другім складзе.**

1) аб'інелы
2) крапіва
3) маленькі
4) сказаны
5) чатырнаццаць

**А10. Адзначце словы, у якіх націск падае на другі склад.**

1) percenька
2) каменны
3) цяжар
4) фартух
5) выпадак

**А11. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя гукі.**

1) ж**у**рба
2) калас**а**ваць
3) нажн**і**цы
4) абагнут**ы**
5) казыт**а**ць

**А12. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя гукі.**

1) алф**а**віт
2) мезен**е**ц
3) п**е**рапіс
4) лат**а**ць
5) насп**е**х

**А13. Адзначце назоўнікі, у якіх пры змене формы склону змяняецца месца націску.**

1) абутнік
2) налíснік
3) барада
4) трызненне
5) поплаў

**А14. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца чаргаванне зычных.**

1) бінт
2) блок
3) скруха
4) паслуга
5) перагог

**А15. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты правільна.**

1) *каларытная* мова
2) *каларыйная* карціна

3) лясныя *недры*
4) *нетры* зямлі
5) *эфектныя* меры

**А16. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты няправільна.**

1) *вынасны* мікрафон
2) *аптэкарскі* халат
3) *выкладваць* у школе фізіку
4) *вадзяністая* гладзь ракі
5) *расаднік* хвароб

**А17. Адзначце словазлучэнні, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў.**

1) дажджлівая восень
2) пясочны бераг
3) галасавы певень
4) галіновае дрэва
5) мудрагелістыя ўзоры

**А18. Знайдзіце памылку ў лексічнай спалучальнасці слоў.**

Марозікам пахне капуста, жаўруковаю песняй – яблык, вераснем – сопкая бульба, расой – агурок крамяністы.

**А19. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя або граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. У дваццаці двух групах вучылішча прайшлі першыя экзамены.
2. Наш сабака ўпарта бег па слядам зайца.
3. У трохстах метрах ад вёскі пачыналася прыгожая зялёная дуброва.
4. Мы з маці хутка прачыталі гэты цікаўны раман.
5. На пісьмовым стале ляжалі тры свежыя газеты.

**А20. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя або граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. Яна мела благія намеры: забраць бацьку да сябе, каб сагрэць яго старасць.
2. Па алеям, па паркам крадзецца восень.
3. На беразе ракі стаялі чацвёра жанчын.
4. Марына вельмі любіць размаўляць з сяброўкай па тэлефону.
5. Андрэй атрымаў залатую медаль за выдатную вучобу.

## Т э с т 9. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

**А1. Выберыце назоўнік, род якога ў беларускай і рускай мовах не супадае.**

1) проблема
2) неделя
3) должность
4) подарок
5) педаль

**А2. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**

1) цень
2) смеласць
3) подпіс
4) адчай
5) дождж

**А3. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**

1) паводка
2) цяля
3) патыліца
4) шво
5) агонь

**А4. Выберыце назоўнік, лік якога ў беларускай і рускай мовах не супадае.**

1) шахматы
2) кружево
3) поединок
4) учебник
5) обычай

**А5. Выберыце назоўнік, лік якога ў беларускай і рускай мовах не супадае.**

1) журнал
2) дверь
3) гусли
4) клещи
5) консервы

**А6. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду.**

1) гар
2) подпіс
3) гусь
4) аташэ
5) неруш

**А7. Знайдзіце словазлучэнне, у якім дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка.**

1) доўгае турнэ
2) капусны вусень
3) азёрны сінь
4) асенняя бездараж
5) кароткі запіс

**А8. Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні да назоўнікаў.**

1) ваенны аташэ
2) са сведкай Пятровым
3) тлумны Баку
4) маленькі шчаня
5) даставіў санітар Шведава

**А9. Адзначце словазлучэнні з марфалагічнымі памылкамі.**

1) шырокія дзверы
2) высокая насып
3) матчыны грудзі
4) з няўмекаю Валодзем
5) доўгачаканыя канікулы

**А10. Адзначце словазлучэнні з марфалагічнымі памылкамі.**

1) старажытная рукапіс
2) спелыя маліны
3) грэцкая крупа
4) дзесятковая дроб
5) маладыя лісці

**А11. Адзначце сказы з марфалагічнымі памылкамі.**

1. Белы гусь важна ходзіць па бабуліным двары.
2. Шырокі стэп ляжаў перад намі.
3. Мы пашылі паліто ў новым атэлье.
4. Здалёк відаць была шырока адчыненая дзвер.
5. Спелая маліна так і цягнула да сябе.

**А12. Адзначце назоўнікі, форма множнага ліку назоўнага склону якіх утворана няправільна.**

1) грамадзяне
2) калектывы
3) паля
4) берагі
5) трактара

**А13. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -у (-ю).**

1) выкананне віртуоз_
2) добрага густ_
3) афіцыйнага візіт_
4) жыў у шалаш_
5) веснавога гром_

**А14. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -ы (-і).**

1) у верасн_
2) аб здароў_
3) на Свіцяз_
4) у гастраном_
5) на рэчц_

**А15. Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.**

1. Хочацца, каб нашым людзям стала радасней жыць на гэтым свеце.
2. Госці на гэтым вяселлі былі больш мілейшыя, чым нашы сваякі.
3. Не ўсе ведаюць, што граб цвярдзей усіх нашых дрэў.
4. Спакуса ўзяць самы найсмачнейшы кавалак была большая за матчыну перасцярогу.
5. Думкі ў час маладосці былі надзвычай светлыя.

**А16. Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі.**

1) васемсот птушак
2) две пятых
3) дзевяноста рублёў
4) шэсць дзявятых
5) стамі чалавекамі

**А17. Знайдзіце назоўнік, які спалучаецца з лічэбнікам *паўтары*.**
1) тона
2) год
3) кілаграм
4) вядро
5) літр

**А18. Адзначце словазлучэнні з няправільным утварэннем дзеепрыметнікаў.**
1) пажаўцелая трава
2) скошаны луг
3) ідучы чалавек
4) памытая падлога
5) сустракаючыяся людзі

**А19. Адзначце дзеепрыслоўі, перакладзеныя правільна.**
1) подобрав – падабраўшы
2) боясь – баючысь
3) держа – трымая
4) улыбаясь – усміхаючыся
5) мечтая – марачы

**А20. Запішыце па беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова.**
1) идти с другом
2) идти долго
3) идти за вещами
4) идти не торопясь
5) идти в школу

## Т э с т 10. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

**А1. Выберыце назоўнік, род якога ў беларускай і рускай мовах не супадае.**
1) чарот
2) туфель
3) бандэроль
4) бездань
5) войска

**А2. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**
1) камізэлька
2) занятак
3) жніво
4) дрэва
5) яліна

**А3. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**
1) паветра
2) рух
3) зяляніна
4) гадзіннік
5) макарона

**А4. Адзначце назоўнікі, лік якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**
1) воплескі
2) дзверы
3) канікулы
4) агародніна
5) прысмакі

**А5. Адзначце назоўнікі, лік якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах.**

1) золата
2) чарніцы
3) суткі
4) падручнік
5) выбары

**А6. Вызначце род назоўнікаў *шымпанзэ, поні, гну, зебу, кенгуру*.**

1) жаночы
2) мужчынскі
3) ніякі
4) агульны

**А7. Знайдзіце словазлучэнне, у якім дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка.**

1) апошні перапіс
2) маленькае кацяня
3) сярэбраная медаль
4) вялікі насып
5) поўны пачак

**А8. Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні да роду назоўнікаў.**

1) снежная завея
2) злая сабака
3) гуллівая кацяня
4) вясенняе мроіва
5) з няўмекай Сашам

**А9. Адзначце словазлучэнні з марфалагічнымі памылкамі.**

1) вялізная ахапка
2) прыгожы кашнэ
3) горкі палын
4) прыгожыя двайняты
5) моцная боль

**А10. Адзначце словазлучэнні з марфалагічнымі памылкамі.**

1) пісаць чарніламі
2) высокая таполя
3) пясчаная насып
4) чырвоная гваздзіка
5) кіслае шчаўе

**А11. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. За чыгуначным насыпам ляжалі роўна складзеныя дровы
2. Валодзя Агейчык яшчэ ў вайну застаўся круглай сіратою.
3. На калегіі выступіў вопытны суддзя Наталля Пятроўна.
4. Няўжо нельга перайсці балота па гэтым доўгім жардзінам?
5. У мікраараёне пачала працаваць новая АТС.

**А12. Адзначце назоўнікі, форма множнага ліку назоўнага склону якіх утворана няправільна.**

1) гарошыны
2) азёра
3) гараджане
4) пашпарта
5) словы

**А13. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -у (-ю).**

1) у камбінезон_
2) на двар_
3) без дакладчык_
4) з дрот_
5) без сэнс_

**А14. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -ы (-і).**

1) у абноўц_
2) у карагодз_
3) пры банкір_
4) у экіпаж_
5) у ліпен_

**А15. Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.**

1. Ім стала крыху лягчэй ісці.
2. Цёмныя цені даўжэй у лагчыне.
3. Чуўся пах гліны, танчэй пахла мякінай.
4. Ночка цёмная глядзела, ды цямнейшай стала.
5. Шчасце гэтага лета было самае найбольшае.

**А16. Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі.**

1) абодвума ўдзельнікамі
2) шасцістамі
3) трымя пятымі
4) дваццаццю
5) сто трынаццацю

**А17. Знайдзіце назоўнік, які спалучаецца з лічэбнікам *паўтары*.**

1) норма
2) мільён
3) тыдзень
4) мех
5) лімон

**А18. Адзначце словазлучэнні з няправільным утварэннем дзеепрыметнікаў.**

1) пагабляваныя дошкі
2) паружавеўшыя шчокі
3) нявыключаны матор
4) выступаючы чалавек
5) куплены аловак

**А19. Адзначце дзеепрыслоўі, перакладзеныя правільна.**

1) черствея – чарсцвеючы
2) споря – спрачаючы
3) задержавшись – затрымаўшыся
4) подобрав – падабраўшы
5) причитая – галосючы

**А20. Запішыце па беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова.**

1) извините за глупость
2) извините за проступок
3) извините нас
4) извините за просьбу
5) извините за неопытность

## К а н т р о л ь н ы  т э с т

**А1. Адзначце слова, у якіх падкрэсленыя літары абазначаюць націскныя галосныя.**

1) прызыўнік  3) супавы  5) павянчаны
2) кіпень  4) прасціна

**А2. Адзначце словы, у якіх націск падае на другі склад.**

1) закід  3) спіна  5) заечы
2) індустрыя  4) засветла

**А3. З пункту гледжання граматычнай катэгорыі роду знайдзіце ў кожным радку пятае лішняе слова.**

1. а) плакса; б) задзіра; в) ваяка; г) праныра; д) злюка
2. а) няўмека; б) ліхачка; в) чысцюля; г) непакора; д) непаседа
3. а) красуня; б) прыгажуня; в) памочніца; г) гаспадыня; д) мямля
4. а) урач; б) аграном; в) інжынер; г) сірата; д) рэктар
5. а) поле; б) малако; в) мора; г) сулугуні; д) таксі

**А4. Выберыце правільныя варыянты.**

1) працоўная мазоль  4) вялікая цень
2) смачная салата  5) аўстралійскі кенгуру
3) залаты медаль

**А5. Выберыце правільныя варыянты.**

1) вялікая ахапка  4) вялікая зала
2) белы гусь  5) дубовая калода
3) чорнае поні

**А6. Выберыце правільныя варыянты.**

1) сонечны Баку  4) дарожная пыл
2) вядомае маэстра  5) злая сабака
3) прасторнае фае

**А7. Выберыце назоўнікі, якія адносяцца да мужчынскага роду.**

1) кальрабі  4) шымпанзэ  7) вета
2) салямі  5) алібі  8) дэндзі
3) аташэ  6) івасі  9) фламінга
10) пенальці

**А8. Ці ўтвараюць форму множнага ліку наступныя назоўнікі?**

а) утвараюць
б) не ўтвараюць
в) утвараюць, але пры гэтым змяняецца лексічнае значэнне слова.

1) малако, сена, мэбля, калоссе
2) поўнач, барацьба, шчасце, студэнцтва
3) хлеб, вада, цукар, магутнасць
4) подзвіг, душа, шафа, студэнт
5) будынак, урач, майстэрня, дошка

**А9. Адзначце правільныя формы.**

1) варота
2) суніца
3) чарніцы
4) грудзь
5) пачка

**А10. Адзначце радкі, дзе ўсе назоўнікі ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак -у (-ю).**

1) розум, жаль, хлеб, хакей, мёд
2) сорам, гром, цукар, лес, світанак
3) сквер, арэшнік, боль, алей, вальс
4) дождж, сухавей, снег, водар, пах
5) дзейнік, бэз, кісларод, пясок, двор

**А11. Знайдзіце памылку ва ўжыванні творнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў.**

1) пісьменнікам Быкавым
2) горадам Жлобінам
3) артыстам Барысавым
4) Іванам Шамякінам
5) Аркадзем Куляшовым

**А12. Падбярыце правільную форму творнага склону адзіночнага ліку ўласных назоўнікаў.**

1) горад Мсціслаў – а) Мсціславам; б) Мсціславым
2) князь Мсціслаў – а) Мсціславам; б) Мсціславым
3) Абласны цэнтр Калінін – а) Калінінам; б) Калініным
4) горад Магілёў – а) Магілёвам; б) Магілёвым
5) Дзяржаўны дзеяч Калінін – а) Калінінам; б) Калініным

**А13. Зыходзячы з канчаткаў меснага склону адзіночнага ліку, адшукайце пятае лішняе.**

1. а) стол; б) бераг; в) снег; г) доктар; д) сын
2. а) герой; б) вучань; в) Мікалай; г) Міхась; д) Колас
3. а) тратуар; б) гараж; в) партызан; г) палец; д) семестр
4. а) лівень; б) каваль; в) вугаль; г) ручай; д) рубель
5. а) гай; б) конь; в) край; г) бібліятэкар; д) май

**А14. У залежнасці ад тыпу скланення выберыце пятае лішняе.**

1. а) жанчына; б) мужчына; в) стараста; г) дзядзька; д) суддзя
2. а) акно; б) ружжо; в) табло; г) сядло; д) шкло
3. а) пароль; б) мазоль; в) куль; г) моль; д) боль

4. а) печ; б) ноч; в) рэч; г) роспач; д) светач
5. а) медаль; б) педаль; в) стэп; г) жаль; д) шынель

**А15. Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны памылкі ў дапасаванні да роду назоўнікаў.**
1) прыгожае жарабя
2) дапамагла ўрач Валошына
3) выразная запіс
4) моцная боль
5) з задзірай Слаўкам

**А16. Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.**
1. Па тэрыторыі Беларусь большая за Балгарыю.
2. Халадней сталі дажджы.
3. Мікола старэйшы за сястру.
4. Здрада страшней за кулю.
5. Суніцы былі больш саладзейшыя, чым мёд.

**А17. Адзначце сказы з памылкамі ва ўжыванні вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.**
1. Салавей пасвістваў то цішэй, то гучней.
2. І найцяжэйшыя раны чалавечай душы загойваюцца.
3. У вёсцы быў калісьці чалавек, вышэй за ўсіх ростам.
4. Сцяпанку на душы было горш ад таго, што фарбаў няма.
5. Ён падумаў, што гэта будзе самая найкарацейшая дарога.

**А18. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**
1. Старэйшага сябе чалавека беларусы здаўна называлі дзядзькам або цёткай.
2. Мікола Гусоўскі – наш самы найбуйнейшы паэт-лацініст.
3. Я меў у жыцці найвялікшае шчасце кахаць.
4. Рукі, у якія ўелася столькі зямлі – найчысцейшыя рукі на свеце.
5. Малодшыя мяне сёстры даўно ўжо замужам.

**А19. Адзначце выпадкі правільнага напісання лічэбнікаў.**
1) восемсот
2) з двухстамі дваццаццю
3) з абодвух кніжак
4) у тысячу дзевяцьсот восемдзесят другім годзе
5) статысячны жыхар

**А20. Знайдзіце лічэбнік, які спалучаецца з назоўнікам *кураняты.***
1) два 2) дзве 3) абодва 4) абедзве 5) двое

**А21. У скланенні лічэбнікаў дапушчана 7 памылак. Укажыце нумары слоў з памылкамі.**

1. Н.с. а) шаснаццаць; б) пяцьдзясят; в) чатырыста; г) шэсцьсот
2. Р.с. а) шаснаццаці; б) пяцідзесяці; в) чатырыста; г) шэсцьсот
3. Д.с. а) шаснаццаці; б) пяцідзесяці; в) чатыромстам; г) шасцюстам
4. В.с. а) шаснаццаць; б) пяцьдзясят; в) чатырыста; г) шэсцьсот
5. Т.с. а) шаснаццацю; б) пяцюдзесяццю в) чатырмястамі; г) шасцюстамі
6. М.с. а) аб шаснаццаці; б) пяцідзесяці; в) чатырохстах; г) шасцюстах

**А22. Адзначце памылкі ва ўжыванні і скланенні лічэбнікаў.**

1) з трыма пісьменнікамі
2) убачыць двух знаёмых студэнтак
3) з дзвюмя дзяўчынкамі
4) сустрэча з чатырма чэмпіёнамі
5) з двума хлопчыкамі
6) узяць абедзвюма рукамі

**А23. Укажыце, у якіх выпадках пры дапасаванні лічэбнікаў да назоўнікаў трэба ўжываць зборныя лічэбнікі *двое, трое.***

1) 2 (лыжкі)
2) 2 (суткі)
3) 3 (бярозы)
4) 3 (вароты)
5) 2 (шахматы)
6) 3 (людзі)

**А24. Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі ўтвораны, ужыты і напісаны правільна.**

1) водзячаяся рыба
2) адрамантаванная дарога
3) узятая кніга
4) павесялелы твар
5) прадуманны план

**А25. Адзначце словазлучэнні, у якіх дзеепрыметнікі ўтвораны, ужыты і напісаны правільна.**

1) затоплены поплаў
2) пасаджанныя кусты
3) пачарнеты комін
4) некрануты лес
5) аглянуўшаяся жанчына

**А26. Адзначце сказы, у якіх дзеепрыслоўі ўтвораны, ужыты і напісаны правільна.**

1. Церушыла поўнач людзям сны, плывя высока над зямлёю.
2. Зашумела нудна восень, даўшы волю хмарам.
3. Пераступаячы парог, Агата ўбачыла нечаканых гасцей.
4. Не азіраясь, Андрэй ішоў далей.

5. У ззянні промняў песцяцца бярозы, галлё спусціўшы да зямлі.

**А27. Адзначце сказы, у якіх дзеепрыслоўі ўтвораны, ужыты і напісаны правільна.**

1. Спакойна сплывае рака, не ведаючы суму і гора.
2. Не спыняючысь ні на хвіліну, павольна плывуць па небе дажджавыя хмары.
3. Абмытая дажджо, дыміцца зямля, дыхаячы на поўныя грудзі.
4. На гладкі пясок пачалі кідацца, даганяючы адна адну, шэрыя марскія хвалі.
5. Магутныя сосны, паказвая з зямлі аголенае карэнне, задуменна глядзелі ў люстра вады.

**А28. Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў.**

1. Урач, даўшы патрэбныя парады, выйшаў з палаты.
2. Успамінаючы дарагія мясціны, смутак ахоплівае мяне.
3. Жанчына, пасадзіўшы дзіця на ложак, стала распранацца.
4. Чытаючы гэту кнігу, у мяне ўзнікла шмат пытанняў.
5. Жнучы, яна стамлялася з кожным днём усё больш і больш.

**А29. Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў.**

1. Гуляючы па вуліцы, мы змерзлі.
2. Гледзячы перадачу, узнікалі цікавыя думкі.
3. Задача рашалася вельмі проста, карыстаючыся новым метадам.
4. Мы заўсёды адпачываем, слухаючы музыку.
5. Прыйшоўшы з канцэрта, ён падзяліўся ўражаннямі з маці.

**А30. Адзначце сказы з памылковым утварэннем або ўжываннем дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў.**

1. Жнучы, жанчыны ціха спявалі.
2. Ехаўшы да бацькоў, Максім думаў пра нешта сваё.
3. Груша грэлася на сонцы, гледзячыся ў раку з узгорка.
4. Ідучы дадому, з’явілася жаданне наведаць сябра.
5. Спакойна засынаючы, сінеюць берагі.

**А31. Адзначце сказы з сінтаксічнымі памылкамі.**

1. Я не хацела вас пакрыўдзіць, выбачайце мяне.
2. Андрэй збіраецца жаніцца з Верачкай.
3. У першы зімовы дзень ён захварэў пнеўманіяй.
4. На пясчаным узгорку раслі тры стромкіх сасны.
5. Мы бываем вельмі няўважлівыя адзін к аднаму.

**А32. Адзначце сказы з памылкамі ў дапасаванні і кіраванні.**

1. Любе здалося, што сястра насміхаецца над яе няўдачай.
2. Ты, ранак, будзь за сведку.
3. На адным месцы і камень абрастае.
4. Раніцай вырашылі ехаць за сенам.
5. Людзі доўга дзіваліся цуду, зробленаму рукамі майстра.

**А33. Запішыце па беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова.**

1) болеть давно
2) болеть оспой
3) болеть душой
4) болеть за команду
5) болеть неделю

**А34. Запішыце па беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова.**

1) смеяться громко
2) смеяться над шуткой
3) смеяться с другом
4) смеяться до слёз
5) смеяться до изнеможения

**А35. Запішыце па беларуску словазлучэнне, якое адрозніваецца ад рускага формай залежнага слова.**

1) взять за руку
2) движение за мир
3) сделать для него
4) прежде всего
5) купить за рубль

**А36. Выберыце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы.**

1) прабачце мяне
2) пайсці па доктара
3) кпіць над Мішам
4) ажаніцца на Марыі
5) ісці ў ягады

**А37. Знайдзіце сказы з памылкай у дзеяслоўным кіраванні.**

1. І вось яна стаіць, высокая, стройная, у шэрай з сінім сукенцы, якая вельмі была ёй да твару.
2. Бацька доўга хварэў грыпам.
3. Міхась быў зусім не падобны на брата і на цэлую галаву вышэйшы за яго.
4. Смяяцца над сабой ён нікому не дазволіць.
5. Я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў ён выбраў для мяне навекі гэты.

**А38. Знайдзіце сказы з памылкай у дзеяслоўным кіраванні.**

1. Маці ніяк не магла нацешыцца з сына.
2. Лагуновіч хрыплым голасам крыкнуў, кааб паслалі за механікам.
3. Дзяўчынка асцярожна ступала па гарачаму пяску.

4. У бацькі хутка дзень нараджэння, і дзеці надумалі спячы к гэтаму святу пірог.

5. Малады доктар першы раз у жыцці рабіў аперацыб старому чалавеку, хвораму на горла.

**А39. Адзначце сказы з сінтаксічнымі памылкамі.**

1. Большасць дрэў пасаджана сёлетняй вясной.
2. Два томікі як два чырвоных святы.
3. Горад добра ведаю, больш года праслужыў там.
4. За ўсё, што вы расказалі, я вас так дзякую.
5. Безліч малых рэк і ручаёў жывіць возера.

**А40. Адзначце сказы з сінтаксічнымі памылкамі.**

1. Два летніх дні яны правялі ў сяброў.
2. Тоня толькі пасмяялася над сваім страхам.
3. Зямля сумуе па плузе і па насенні, па жніўнай песні.
4. У васьмі кіламетрах адсюль у быстры Нёман упадае ціхая рачулка Вуша.
5. Тут Колас раніцою ў грыбы хадзіў.